# «ДНО МНОГІХ ВАДАЁМАЎ ПЕРАТВОРАНА Ў СМЕТНІК»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Каб прачасаць вадаём дыяметрам у 20 метраў, спатрэбіліся два апараты на сціснутым паветры. Да таго ж бачнасць у вадзе — як уначы з заплюшчанымі вачыма. Доўгі час туды падалі ствалы дрэў, таму на дне ўтварылася нейкае месіва, якое шчодра разбавілі пластыкавыя і шкляныя бутэлькі. А пры рабоце навобмацак пластыкавая бутэлька вельмі падобная на чалавечую руку.

Каля трох гадзін працягваліся пошукі. Безвынікова. Вадалазы прачасалі і суседняе азярцо. Вынік такі ж — адмоўны. Хлопчык, якога знайшлі, прызнаўся, што ўсё выдумаў...

Добра, што гэтая гісторыя скончылася такім чынам. Але бывае так, на жаль, далёка не заўжды. Акрамя псіхалагічнага фактару, ёсць у нялёгкай, але адказнай рабоце вадалазаў і іншыя адметнасці. Якія ж? Аб гэтым карэспандэнт «Звязды» даведаўся, наведаўшы Цэнтр вадалазна-ратавальнай службы Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС.



## Бачнасць пад вадой рэдка перавышае метр

— Мы працуем з 1991 года, — расказвае **начальнік Цэнтра вадалазна-ратавальнай службы Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС Дзяніс САСНОЎСКІ.** — У 2002-м штатныя вадалазныя службы з'явіліся ў кожным рэгіёне краіны. Цяпер іх налічваецца восем. А яшчэ праз пяць гадоў на Цнянскім вадасховішчы ў Мінску запрацаваў Цэнтр вадалазна-ратавальнай службы для каардынацыі работы падводных спецыялістаў па ўсёй краіне.

З'явіліся ў беларускіх вадалазаў сучасная амуніцыя і абсталяванне. Сярод «фішак» — станцыі хуткага разгортвання. Яны маюць правадную тэлефонную сувязь. Раней жа зносіны вадалаза і берага былі магчымыя толькі дзякуючы сігнальнаму канцу. Да таго ж яны дазваляюць неабмежаваную колькасць разоў мяняць паветра, што павялічвае знаходжанне спецыяліста пад вадой.

Вадалазы звычайна працуюць на глыбіні 6—8 метраў. Але... робяць гэта, па сутнасці, навобмацак. Справа ў тым, што бачнасць у беларускіх вадаёмах вельмі кепская. Нават зімой яна не перавышае 3—5 метраў. А ўлетку і ўвогуле скарачаецца да дыстанцыі выцягнутай рукі. Але трэніравацца для такой складанай работы ёсць дзе.

— На Цнянскім вадасховішчы абсталяваны спецыяльны падводны вадалазны палігон. Ён унікальны ў краіне, — гаворыць **начальнік аддзела вадалазнай падрыхтоўкі Андрэй ВОЙЦІК.** — Ствaралі мы яго самастойна. Там уладкаваны трэніровачныя пляцоўкі, на якіх змадэляваны некалькі сітуацый. Гэта і пошук разнастайных прадметаў, і падводная астропка, і ратаванне людзей.

Каб падтрымліваць сваю кваліфікацыю, кожны вадалаз у залежнасці ад свайго разраду мусіць мінімальна правесці на глыбіні ад 50 да 90 гадзін за год. Выканаць гэтую норму няпроста з улікам працоўнага графіку: спецыялісты аддзела вадалазна-ратавальных работ дзяжураць суткі праз двое. І часта знаходзяцца там не адны: вадалазнаму майстэрству вучацца некаторыя прадстаўнікі Міністэрства абароны, органаў унутраных спраў і нават падраздзялення «Алмаз». Вынікі кажуць за сябе — за 4 гады спецыялісты аддзела вадалазнай падрыхтоўкі навучылі сакрэтам прафесіі 157 чалавек.

У 2013 годзе на базе Цэнтра з'явілася мабільная перасоўная баракамера. Яна дапамагае паназірраць, як нававбранец пачувае сябе пад вадой пад павышаным ціскам. З ёй працуе ўрач-спецфізіёлаг, які прайшоў падрыхтоўку ў Санкт-Пецярбургу і атрымаў кваліфікацыю вадалазнага ўрача.

Ёсць сярод вадалазаў на Цнянцы і сапраўдны ветэран. Падводны «стаж» **старшага прапаршчыка ўнутранай службы Сяргея АМБРАЖЭЯ** больш чым дванаццаць гадоў перастуціў ужо адзнаку ў тысячу гадзін. Ён таксама ўзнагароджаны медалём «За бездакорную службу».

## Знайсці нож на дне кар'ера

Здараюцца ў рабоце вадалазаў і так званыя чорныя кур'ёзы. Паступіла паведамленне аб тым, што на Цнянцы патануў чалавек. Тапельца дасталі, але аказалася, што... гэта не той. Нябожчык, якога шукалі, знаходзіўся за 5—7 метраў ад першага.

— Баявыя патроны, нажы знаходзім пастаянна, — расказвае **вадалазны спецыяліст Цэнтра вадалазна-ратавальнай службы МНС Дзмітрый БАРАНОЎСКІ.** — Увогуле, падводны свет — гэта адзін вялікі склад.

Прыводзіць да кур'ёзных выпадкаў і дурасць. Да нас паступіў выклік, што на вадасховішчы Дразды машына пайшла пад лёд. Прыязджаем туды, бачым: стаяць два чалавекі, гутараць. Пачынаем высвятляць абставіны здарэння. Аказалася, хлопцы вырашылі паспрачацца, хто далей па лёдзе праедзе, намалюе васьмёрак у дрыфце і вернецца назад. Выйграў той, чыя машына патанула. Ну што ж, апускаюся. Скажу адразу — такой прыгажосці за ўсё жыццё не сустракаў. Бачнасць у вадзе метраў 5—7. Яркае сонца пераліваецца, асвятляе новы прыгожы джып з усіх бакоў, нібы ў салоне...

Падымаюць вадалазы са дна і тэхніку. Непадалёк ад Заслаўя на кар'еры забуксаваў смецціявоз. На выручку адправіўся трактар, які таксама не адолеў пяскі. Падагналі другі трактар, пасля экскаватар — і праз некаторы час уся гэтая кавалькада апынулася на дне кар'ера. Прычым работу ўскладняе наліпанне грунту. Калі нета-вага таго ж экскаватара складае 37 тон, то пасля таго, як ён праляжыць пэўны час у вадзе, яна можа павялічыцца да 150 тон і нават болей! А вадалазам трэба ўсю гэту масу пад вадой размясціць спецыяльнай установкай. І рабіць гэта хутка. У рэшце рэшт трактары і смецціявоз на бераг выцягнулі.

— А аднойчы паступіла заданне знайсці на дне кар'ера ў Калодзішчах пад Мінскам нож, які мусіў быць рэчавым доказам у крымінальнай справе, — згадвае вадалаз. — Нырнулі ў копанку, дасталі, — а нож не той. Дасталі наступны — зноў не той. Агулам з вады былі выцягнуты шэсць нажоў! Цікава, як яны туды ўсе трапілі?

Дзмітрый Бараноўскі валодае незвычайнай для вадалаза дадатковай спецыяльнасцю. Ён падводны рэзчык-зваршчык металу. Для таго каб навучыцца гэтай прафесіі, трэба ехаць у Расію. І набытыя веды вельмі спатрэбіліся ў 2007 годзе, калі на Заходняй Дзвіне каля Віцебска абваліўся мост. Работу вадалазаў ускладняла тое, што з моста сарвала ўсе злучэнні, і яго канструкцыі апынуліся пікамі вострай арматуры, якая тырчала ва ўсе бакі. Небяспеку стваралі і лёгкаўзгаральныя газы, якія ад работы зварачнага апарату вельмі хутка збіраліся наверсе.

— Але ў мяне нешта апускаецца ў душы, калі да нас паступае выклік на пошукі чалавека на Чыжоўскім вадасховішчы, — працягвае суразмоўнік. — Туды мы ідзём толькі ў «сухім» касцюме. Гэты тэхнічны вадаём — па сутнасці, адна вялікая звалка. Чаго там толькі на дне няма — арматура, бутэлькі і нават футбольныя вароты! Даходзіла нават да таго, што стальныя балкі ламалі вінты нашых катараў. Як па мне, то там праз кожныя 5 метраў трэба ставіць слупок «Купацца забаронена»...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

**Фота з архіва Цэнтра вадалазна-ратавальнай службы Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС.**

# ЯКІМ БЫЦЬ ПАДМІКОЛЛЮ?

## У ПОШУКАХ КАНСЭНСУСУ

Тут сышліся гістарычныя, рэлігійныя, прыродаахоўныя інтарэсы. Два месяцы таму «Звязда» пісала пра тое, што частка жыхароў выступіла супраць будаўніцтва ў Падміколлі фестывальнай пляцоўкі і гандлёва-забаўляльнага цэнтра. Іх меркаванні ўлічаны. Але ёсць разыходжанні ў поглядах на іншых пытаннях. Напрыклад, наконт спуску ад плошчы Арджанікідзэ да галоўнага ўваходу ў парк. **Галоўны архітэктар праекта, начальнік архітэктурна-планіровачнага аддзела інстытута «Магілёўграмадзянпраект» Таццяна БЕЛЬСКАЯ** прапаноўвае парадную лесвіцу з ратондамі, глядзельнымі пляцоўкамі і фантанамі. А вось **старшыня Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон АСТАПОВІЧ** лічыць, што танней будзе аднавіць Алейную браму і стварыць падземны пераход. Гэта, маўляў, болей упішацца ў прапанаваны тым жа архітэктарам варыянт "вясельнай зоны" — своеасаблівага вострава са штучнымі воднымі каналамі.

Няма аднадумства ў адносінах развіцця ландшафтна-рэкрэацыйнай зоны Падміколля. Прыхільнікі гарадской ініцыятывы з аднайменнай назвай, напрыклад, выступаюць за стварэнне тут батанічнага саду і некалькіх паркавых зон для дзяцей, моладзі і людзей больш сталага ўзросту без капітальных збудаванняў.

## АДРАДЖЭННЕ СВЯТЫНІ

Дакладна вядома, што тэрыторыю Падміколля ўпрыгожыць Свята-Пакроўская царква, дазвол на будаўніцтва якой ужо ёсць. Для праваслаўных яна каштоўная яшчэ і тым, што гэта апошняе месца служэння святога магілёўскага архіепіскапа — свяшчэннамучаніка Паўліна, які быў расстраляны ў 1937 годзе. Па благаславенні епіскапа Магілёўскага і Мсціслаўскага Сафронія адраджэннем святыні ўжо сёлета зоймецца Свята-Мікольскі жаночы манастыр.

Свята-Пакроўская царква наогул знамянальны для Падміколля аб'ект, бо раней, калі яна існавала, мясцовасць так і называлася — Пакроўскі пасад. Рэшткі яе званіцы ў гонар Архангела Міхаіла археолагі знайшлі ў 2014 годзе падчас раскопак. Царква і званіца былі пабудаваны ў XVII стагоддзі і знесены ў 1948 годзе. Храм плануецца аднавіць на тым жа самым месцы, дзе яна і знаходзілася, прыкладна за 400 метраў ад Свята-Мікольскага манастыра.

Дарэчы, тыя, хто жадае паўдзельнічаць у адраджэнні святыні, могуць падтрымаць ініцыятыву, пералічыўшы сродкі на разліковы рахунак манастыра (3135430408011, код 739, БІК 153001739, УНП 700346341).



Абыякавых на круглым стале не было.

Не выключана, што з часам будуць адроджаны і іншыя культавыя будынкі, якія калісьці ўпрыгожвалі Падміколле, — касцёл Святога Антонія і сінагога. Але на ўсё патрэбны грошы і нават спецыялісты яшчэ не заглядваюць так далёка ў будучыню. «Цяпер дарогу праектуем, будзем прапрацоўваць спуск каля цэнтральнай алеі, першая чарга якой ужо зроблена. Наперадзе яшчэ шмат працы», — каротка растлумачыў галоўны архітэктар горада Уладзімір Скачак.

## ДАВЕРЫМСЯ СПЕЦЫЯЛІСТАМ

Актыўнасць грамадзян прымушае спецыялістаў асабліва адказна адносіцца да сваёй задачы.

— У Магілёве вельмі неабыякавая грамадскасць, і тое, што гараджане так хвалююцца за будучыню свайго горада, радуе, — адзначыла намеснік **старшыні Магілёўскага гарвыканкама Ала ГАЛУШКА.** — Не страшна, што так шмат прапаноў. Гэта дае магчымасць знайсці найлепшы варыянт, зрабіць з гэтага месца разыначку.

**Старшыня пастаяннай камісіі па эканамічным развіцці, інвестыцыйнай і інавацыйнай дзейнасці, прадпрымальніцтве Магілёўскага гарсавета дэпутатаў Уладзімір КАВУНОЎ** лічыць, што ў гэтай справе трэба больш давярыцца прафесіяналам.



Падчас абмеркавання праекта.

— Падміколле для кожнага магілёўчаніна — знакавае месца, гістарычнае, экалагічнае, — кажа ён. — Таму нельга даваць яго на водкуп грамадскасці. Бо колькі людзей, столькі меркаванняў. Калі кожнае ўлічваць, можна наогул нічога не зрабіць. Але гэтым павінны займацца спецыялісты. Дзякуючы ім у Магілёве ўжо існуюць прыгожыя зоны адпачынку ўздоўж ракі Дубравенкі, у Буйнічах. І гэта будзе не горш.

### Каментарый у тэму

**Галоўны архітэктар вобласці Аляксей НОВІКАЎ:**

— Генеральны план Магілёва распрацоўваўся галоўным інстытутам рэспублікі, яго стварала, аналізавала, абмяркоўвала вялікая колькасць людзей. Падміколле захаваецца як зона цiхага, актыўнага адпачынку. Прапановы вітаюцца, свежыя ідэі таксама, але праекціроўшчыкі прынцыпова спрабуюць захаваць гісторыю, аднавіўшы частку той архітэктуры, якая характэрна была для губернскага Магілёва.

Дарэчы, па выніках пасяджэння ў адрас БелНІІПградабудаўніцтва накіраваны пратакол, дзе, акрамя таго, што горад адмаўляецца ад гандлёва-забаўляльнага цэнтра і фестывальнай пляцоўкі, пазначана неабходнасць распрацоўкі горадабудаўнічага праекта спецыяльнага планавання Падміколля і стварэння працоўнай групы, у якую ўвойдзе таксама і зацікаўленая ў далейшым развіцці парка грамадскасць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*